# З далёкай даўніны

**Выйшла з друку кніга Андрэя Мяцельскага «Уладальнікі старога Мсціслава. Гістарычныя партрэты». Аўтар прысвяціў сваю працу ўладальнікам Мсціслава — аднаго з найпрыгажэйшых і найцікавейшых гарадоў Беларусі на розных гістарычных этапах развіцця нашай Айчыны. З выдавецкай анатацыі да кнігі: «…Расказваецца, хто і калі ў Сярэднявеччы валодаў горадам, паказваецца іх уклад і ў развіццё Мсціслава, і ў агульнадзяржаўныя справы. Асобныя главы прысвечаны князям Мсціслаўскім, што жылі ў Вялікім Княстве Літоўскім, а таксама ў Рускім царстве. Дарэчы, Андрэй Мяцельскі і раней звяртаўся да гісторыі Мсціслаўшчыны. Добра вядомая яго праца «Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII—XVIII стст.».**




Старажытнаму гораду прысвечана не адно гістарычнае, гісторыка-краязнаўчае, публіцыстычнае даследаванне. З найболей блізкіх па часе — кніга «Старажытны Мсціслаў» М. Ткачова, А. Трусава. Праца А. Мяцельскага сцвярджае жаданне аўтара сабраць усе магчымыя звесткі, якія тычацца гаспадароў Мсціслава, расказаць, спасылаючыся на дакументальныя, архіўныя крыніцы, пра іх уклад у развіццё горада, дзейнасць у той краіне, якой яны служылі. Першая глава — «Смаленскія ўладары Мсціслава». Другая — «Мсціслаў у складзе ВКЛ». Трэцяя — «Новая дынастыя князёў Мсціслаўскіх: князь Міхаіл Іванавіч». І, нарэшце, чацвёртая — «Князі Мсціслаўскія на маскоўскай службе».

Грунтоўнае навуковае выданне чытаецца лёгка, нязмушана, дапамагае ажыццявіць цікавае віртуальнае падарожжа ў часе, разгледзець мінуўшчыну Мсціслава ў розных падзеях, праявах. Кніга багата ілюстравана, выканана на высокім паліграфічным узроўні (аддрукавана ў ААТ «Транстэкс» накладам 300 экзэмпляраў). Добрая якасць рэпрадукцый розных партрэтаў, архіўных дакументаў, фрагментаў старадрукаў — істотная характарыстыка выдання. Таму варта параіць звярнуцца да кнігі розным аўтарам, якія займаюцца папулярызацыяй айчыннай гісторыі, узмацніўшы пры нагодзе свае публікацыі якаснымі ілюстрацыямі.

Праца А. Мяцельскага выйшла ў «Беларускай навуцы» ў межах выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021—2025 гады «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А. А. Каваленя).

**Сяргей ШЫЧКО**